



# СВЯТА ГРАЦЫІ І НАТХНЕННЯ

Пакуль вясна яшчэ не напоўніцу радуе нас цяплом, яркімі фарбамі і эмоцыямі, а значыць, шукаць іх можна ў нашых фотарэпартажах. Нагоды для гэтага заўсёды знойдуцца. Напрыклад, у першы тыдзень сакавіка сваіх каралеў прыгажосці вызначалі адразу ў дзвюх сталічных ВНУ — Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце і ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце.





На конкурсе грацыі і артыстычнага майстэрства «Міс БДЭУ — 2024» карону пераможцы прымерала студэнтка ўліковa-эканамічнага факультэта Велорыя Яўменава. А ўвогуле за званне найлепшай прыгажуні змагаліся дзесяць прэтэндэнтак, па прадстаўніцы ад факультэта. Шлях да перамогі праходзіў у некалькі этапаў: пралогавае дэфіле, відэавізітоўка і прамоўніцкае майстэрства, народнае дэфіле, конкурс творчых нумароў і жаночае дэфіле.

А вось конкурс грацыі і артыстычнага майстэрства «Міс МДЛУ — 2024» даў магчымасць студэнткам-удзельніцам праявіць сябе ў навуцы, спорце, валанцёрстве і творчасці. У зале, напоўненай усмешкамі і святлом соцень вачэй, за галоўны тытул змагаліся восем прэтэндэнтак. У пагоні за адпаведнасцю ідэалу ні адна з дзяўчат не забыла аб прыгажосці душы, думак і сэрца. І кожны конкурс быў пацвярджэннем гэтага. Напрыклад, на конкурсе прамоўніцкага майстэрства студэнткі давалі характарыстыку якасцям чалавека альбо прэзентавалі гледачам свае творчыя нумары. Яркім завяршэннем конкурснай праграмы стала дэфіле ў вясельных сукенках. Перамогу ў намінацыі «Міс натхненне» і тытул «Міс МДЛУ — 2024» прысудзілі Аліне Субоце. Пазней дзяўчына падзялілася:

«Стаць удзельніцай конкурсу грацыі і артыстычнага майстэрства «Міс МДЛУ» было маёй марай з першага курса. І сёння я яе здзейсніла. На працягу пяці гадоў актыўна выступаю на сцэне нашага ўніверсітэта ў якасці вядучай, а вось роля канкурсанткі стала для мяне чымсьці новым і хвалюючым. На працягу месяца мы кожны дзень рэпеціравалі. Гэта быў доўгі і працаёмкі шлях, але мы справіліся. Цяпер магу сказаць толькі адно: я бязмежна шчаслівая!»

Віншуем пераможцаў і жадаем змяняць сваёй прыгажосцю, крэатыўнасцю і шчырасцю свет да лепшага, а таксама скарыць яшчэ безліч новых вяршынь!

**Фота Лізаветы ГОЛАД і Віктара ІВАНЧЫКАВА.**





